**7 кастрычніка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла прэзентацыя кнігі Францішка Жылкі **«Млынарства ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць»** (2021).

Францішак Баляслававіч – ураджэнец Смаргоншчыны, прадпрымальнік, мецэнат, даследчык-краязнаўца, аўтар выданняў «Вілія вачыма вандроўніка: краязнаўчыя нарысы» (2012), «Мае ўспаміны» (2018) і шэрагу артыкулаў.




Яго новае выданне, дзе адлюстраваная гісторыя мукамольнай справы ў Беларусі, выйшла сёлета ў выдавецтве «Энциклопедикс». Ф. Жылка склаў фотатэку са здымкаў пачатаку XXI ст., на якіх зафіксаванае багацце разнастайнай архітэктуры вадзяных млыноў Беларусі, іх гарманічнае спалучэнне з навакольнай асяроддзем.

У кнізе змешчана каля 500 даўніх і сучасных фатаграфіяў, апісаны цікавыя тэхнічныя і гістарычныя дэталі, а таксама выкарыстаныя матэрыялы з успамінаў нашчадкаў беларускіх млынароў. Выданне ўключае спісы вадзяных млыноў з архіваў Вільні і Мінска, а таксама раздзелы, прысвечаныя млынам і млынарству ў вуснай народнай творчасці і творах мастакоў Беларусі.

Пад час мерапрыемства адбылася сустрэча з аўтарам і ўдзельнікамі выдавецкага праекта. Увазе гасцей прадставілі кнігу і выставу-прагляд твораў аўтара і выданняў, прысвечаных млынарству на Беларусі.